# ЦУДОЎНАЯ І НЕПАЎТОРНАЯ АШМЯНШЧЫНА: ЛІТАРАТУРНА-ТУРЫСТЫЧНЫ ВЕЛАПРАЕКТ

***Багдановіч Марта Іванаўна,***
*настаўнік беларускай мовы і літаратуры,*
*ДУА «Сярэдняя школа №3 г. Ашмяны»*
*(г. Ашмяны, Республика Беларусь)*

У артыкуле змешчана інфармацыя аб структуры літаратурна-турыстычнага велапраекта. Дадзены праект складзены з мэтай захавання літаратурнай спадчыны малой радзімы.

Праект скіраваны на павышэнне чытацкай пільнасці і захаванне здароўя праз велавандроўкі па Ашмяншчыне.

Літаратурна-турыстычны праект выкарыстоўваюць у навучальных установах пры планаванні шостага школьнага дня, пры правядзенні экскурсій сумесна з законнымі прадстаўнікамі вучняў, пры арганізацыі экскурсій з турыстамі.

**Ключавыя словы:** літаратурна-турыстычны велапраект, турыстычныя аб’екты, славутасці, відэаролікі і фотаздымкі населеных пункаў, звесткі аб жыцці і творчасці мясцовых паэтаў, развіцце пазнавальнага інтарэсу моладзі да вывучэння літаратуры мясцовай пісьменнікаў.

Актуальнасць даследавання абумоўлена тым, што Ашмянскі раен у апошні час стаў вядомым сваімі турыстычнымі аб’ектамі: гэта і Гальшанскі замак, і помнік Ф. Багушэвічу ў весцы Жупраны, і знакамітыя людзі Ашмяншчыны (Ч. Янкоўскі, А. Адынец, А. Снядэцкі, З. Мінейка, Р. Ануфрыева, Г. Кеўра, В.Ліштван і іншыя). На жаль, мясцовая моладзь не ведае і не цікавіцца літаратурнымі набыткамі роднага краю.

Акрамя таго, у наш час востра паўстала праблема чытацкай пільнасці сярод моладзі. Інтэрнэт трывала ўвайшоў у жыцце сучаснай моладзі. Гэта негатыўна ўплывае на здароўе чалавека, а таксама значна зніжае цікавасць да папяровай кнігі. Таму быў створаны наш праект, які накіраваны на павышэнне чытацкай пільнасці і захаванне здароўя праз велавандроўкі па Ашмяншчыне.

Мэта нашага праекта – захаванне літаратурнай спадчыны малой радзімы.

Зыходзячы з мэты, мы вызначылі задачы нашага праекта:

1. Вывучыць гісторыю роднага краю.
2. Пазнаеміцца з жыццем і творчасцю паэтаў, якія жылі і пражываюць у Ашмянскім раене.
3. Скласці максімальна зручныя літаратурныя веламаршруты па Ашмяншчыне.

Для стварэння праекта мы вызначылі асноўныя напрамкі дзейнасці і метады працы над ім:

1. Збор і вывучэнне матэрыялаў (літаратуры па тэме, выкарыстанне інтэрнэт-крыніц, СМІ, паездкі па маршрутах, сустрэчы з паэтамі).

2. Складанне дадаткаў: апрацоўка і сістэматызацыя атрыманых дадзеных, стварэнне віртуальнай велаэкскурсіі.

3. Папулярызацыя маршруту: правядзенне экскурсіі для турыстаў, трансляцыя праекта ў СМІ, у інтэрнэце, афармленне памятных буклетаў.

Чаканым вынікам нашага праекта павінна стаць развіцце пазнавальнага інтарэсу моладзі да вывучэння літаратуры мясцовай пісьменнікаў, якія ўславілі наш родны горад, праз пошукавую дзейнасць і публічныя выступленні.

Намі распрацаваны сайт, у якім змешчаны электронная карта з веламаршрутамі і іх інфармацыяй, галерэя, зваротная сувязь. Тут можна знайсці інфармацыю пра турыстычныя аб'екты, славутасці, відэаролікі і фотаздымкі населеных пункаў, звесткі аб жыцці і творчасці мясцовых паэтаў, якія жылі, пачынаючы з сярэдзіны XIX стагоддзя і да нашых дзен.

Распрацаваны наступныя літаратурна-турыстычныя веламаршруты:

Першы: Ашмяны – Паляны – Жупраны – Станцыя Ашмяны – Дакурнішкі.

Другі: Ашмяны – Навасяды – Кальчуны – Мардасы – Вайшнарышкі.

Трэці: Ашмяны – Наваселкі – Баруны – Гінеўцы – Гейстуны.

Чацверты: Ашмяны – Гальшанах – Маркінята.

Для праходжання маршрутаў быў абраны велапаход.

**Маршрут першы**

Ашмяны – Паляны – Жупраны – Станцыя Ашмяны – Дакурнішкі.

Агульная адлегласць – 52,2 км.

Агульны час – 132 хвіліны – 2 гадзіны 12 хвілін.

**Першы прыпынак: веска Паляны**

Адлегласць: з г.Ашмяны да в.Паляны – 8,2 км; час – 21 хвіліна.

**Славутасці (турыстычныя аб'екты)**

Веска Паляны славіцца ў першую чаргу Капліцай Святой Ганны на могілках (1810), сядзібай Янкоўскіх (XIX ст.). [3]

**Паэты**

У весцы нарадзіўся **Чэслаў (Часлаў) Янкоўскі** (9 снежня 1857, на Ашмяншчына, – кастрычнік 1929; псеўданімы: Чэслаў; Літвін) – польскі паэт, крытык, публіцыст, гісторык-краязнавец.

Пісаў лірычныя вершы, літаратурныя нарысы, займаўся перакладамі. Аўтар 4-томавага даследавання «Ашмянскі павета» (Powiat Oszmiański, 1896–1900). [2]

**Другі прыпынак: аграгарадок Жупраны**

Адлегласць з в. Паляны да аг. Жупраны – 18,2 км; час – 46 хвілін.

**Славутасці (турыстычныя аб'екты)**

У гэтай мясцовасці знаходзяцца:

- магіла і помнік паэту Ф. Багушэвічу (1958);
- касцел Святых апосталаў Пятра і Паўла (1854–1875);
- яўрэйскія могілкі;
- плябанія (кан. XIX – пач. XX стст.). [3]

### Паэты

**Францішак Бенедыкт Казіміравіч Багушэвіч** (21 сакавіка 1840, фальварак Свіраны, – 28 красавіка 1900) – беларускі грамадскі дзеяч, паэт, празаік, публіцыст і перакладчык. Адзін з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры. [3]

У мясцовай школе створаны літаратурны музей, які прысвечаны жыццю і творчасці паэта. [5]

### Прыпынак трэці: аг. Станцыя Ашмяны – в. Дакурнішкі

Адлегласць ад аг.Жупраны да аг.Станцыя Ашмяны і в. Дакурнішкі – 6,8 км; час – 17 хвілін.

### Славутасці (турыстычныя аб’екты)

Аграгарадок Станцыя Ашмяны – чыгуначная станцыя ў Ашмянскім раене Гродзенскай вобласці. Размешчана паміж станцыяй Солы і прыпыначным пунктам Скрэсціны.

**Даку́рнішкі** – веска ў Ашмянскім раене Гродзенскай вобласці. Уваходзіць у склад Жупранскага сельсавета. [3]

У мясцовай школе знаходзіцца краязнаўчы музей. [4]

### Паэты

Аграгарадок Станцыя Ашмяны і веска Дакурнішкі знакаміты іменамі сучасных паэтаў:

**Эдвард Сяргей.** Жыве з сям'ей на станцыі Ашмяны. Родны край, мясцовыя людзі, іх звычаі і ўклад жыцця сталі жыватворнай крыніцай для яго творчасці. Захапляе аўтара паэзія Сяргея Ясеніна і Уладзіміра Высоцкага.

**Анатоль Кавалеўскі.** Нарадзіўся ў 1933 годзе ў г. Віцебску. У Ашмянскім раене жыве з 1945 года. З 1959 года працаваў у Дакурнішскай СШ настаўнікам. Цяпер на пенсіі. Пісаць пачаў у 50-я гады мінулага стагоддзя.

### Маршрут другі

Ашмяны – Навасяды – Кальчуны – Мардасы – Вайшнарышкі.

Агульная адлегласць – 50 км.

Агульны час – 128 хвілін – 2 гадзіны 8 хвілін.

### Прыпынак першы: в. Навасяды

Адлегласць з г. Ашмяны да в. Навасяды – 5 км; час – 13 хвілін.

### Славутасці (турыстычныя аб’екты)

Месца масавага знішчэння вескі Навасяды. Пахавана 44 мірныя жыхары, якія былі расстраляны ў лістападзе 1942 года, прозвішчы невядомы. Створана пліта з надпісам «Жертвам фашизма ВОВ 1941–1945 годы» і металічны крыж. Помнік адкрыты ў 1967 годзе). [9]

### Паэты

**Аляксандр Астрамовіч** (псеўданім **Андрэй Зязюля**, в. Навасады; 1878–1921) – каталіцкі святар, паэт. Выдаў зборнік паэзіі «З роднага загону» (Вільня, 1913), паэму «Слова праўды аб мове і долі беларуса» (Прага, 1917). Выйшла яго вершаванае апавяданне «Аленчына вяселле» (Вільня, 1923). Збіраў народныя песні, якія разам з запісамі Антона Грыневіча склалі зборнік

«Беларускія песні з нотамі» Т. 2. (Пецярбург, 1912). Аўтар беларускага рэлігійнага гімна «Божа, што калісь народны…».) [7]

**Генуэфа Кеўра** (1949, в. Валодзькаўшчына) жыве з сям’ей у Навасядах. Працоўны стаж медсястры 39 гадоў. Знаходзіцца на пенсіі. Піша вершы аб родным краі, каханні і жыцці. Часта друкуецца ў раеннай газеце «Ашмянскі веснік».

**Прыпынак другі: аг. Кальчуны**

Адлегласць ад в. Навасяды – 3 км; час – 8 хвілін.

**Славутасці (турыстычныя аб’екты)**

У сценах Кальчунскай сярэдняй школы размешчаны музей Анджэя Снядэцкага – выдатнага польскага вучонага-хіміка, урача, філосафа і асветніка. [6]

**Прыпынак трэці: в. Мардасы**

Адлегласць ад в. Кальчуны – 4 км; час – 10 хвілін.

**Паэты**

**Ігар Спірыдовіч** (1966, г. Роўна Украінскай ССР) жыве ў весцы Мардасы, працуе ў ЖКГ слесарам-сантэхнікам. Усе свае жыцце стварае самае прыгожае, што можа тварыць чалавек, – паэзію. Сваю першую байку напісаў у трэцім класе. Свае вершы друкуе ў газеце «Ашмянскі ваеснік».

**Прыпынак чацверты: в. Вайшнарышкі**

Адлегласць ад в. Мардасы – 13 км; час – 33 хвіліны.

**Паэты**

**Ядвіга Чаплінская** (веска Падгаі Граўжышкоўскага сельскага савета). Усе свае жыцце звязала з педагогікай, працуючы ў Вайшнарышскай базавай школе. У Вайшнарышках яна і жыве са сваей сям’ей. Яе паэтычныя радкі пра прыгажосць беларускай зямлі, чалавечую дабрыню, родныя карані даюць ей сілы жыць у гармоніі і радасці.

**Маршрут трэці**

Ашмяны – Наваселкі – Баруны – Гінеўцы – Гейстуны.

Агульная адлегласць – 73 км.

Агульны час – 182 хвіліны – 3 гадзіны 2 хвіліны.

**Прыпынак першы: аг. Наваселкі**

Адлегласць ад г. Ашмяны – 10 км; час – 25 хвілін.

**Паэты**

**Алена Місюк** – былая настаўніца беларускай мовы і літаратуры Наваселкаўскай школы, аўтар шматлікіх вершаў, удзельнік некалькіх мясцовых літаратурных аб’яднанняў. Друкавалася на старонках раеннай газеты.

**Прыпынак другі: в. Гінеўцы**

Адлегласць ад аг.Наваселкі – 10 км; час – 25 хвілін.

**Паэты**

**Ірына Ізбіцкая** – аўтар шматлікіх літаратурных твораў, працавала ў сельскай бібліятэцы вескі Гінеўцы.

**Прыпынак трэці: в. Баруны**

Адлегласць ад в. Гінеўцы – 9 км; час – 23 хвіліны.

**Славутасці (турыстычныя аб’екты)**

- касцел святых апосталаў Пятра і Паўла;
- абраз Маці Божай , які лічыцца цудатворным;
- помнік воінам Першай сусветнай вайны;
- вайсковыя могілкі. [1]

**Прыпынак чацверты: в. Гейстуны**

Адлегласць ад в. Баруны – 7 км; час – 18 хвілін.

**Славутасці (турыстычныя аб’екты)**

**Гейстуны** – веска ў Ашмянскім раене Гродзенскай вобласці. Уваходзіць у Барунскі сельсавет. Тут у 1804 годзе нарадзіўся Антоній Эдвард Адынец. [3]

**Паэты**

**Антоній Адынец** – паэт, перакладчык, мемурыст, сябар Адама Міцкевіча. Нарадзіўся ў 1804 годзе ў весцы Гейстуны Ашмянскага павета. [10]

**Маршрут чацверты**

Ашмяны – Гальшанах – Маркінята.

Агульная адлегласць – 57 км.

Агульны час – 143 хвіліны – 2 гадзіны 23 хвіліны.

**Прыпынак першы: аг. Гальшаны**

Адлегласць ад г. Ашмян – 21,6 км; час – 54 хвіліны.

**Гальша́ны** – веска ў Беларусі, на левым беразе ракі Гальшанкі; старадаўняе месца гістарычнай Ашмяншчыны (частка Віленшчыны).

**Славутасці (турыстычныя аб’екты)**

- гістарычная забудова мястэчка (кан. XIX – пач. XX стагоддзяў).
- замак Сапегаў, руіны (XVII ст.).
- капліца прыдарожная (XIX ст.).
- касцел Святога Яна Хрысціцеля і кляштар францішканаў (1618).
- млын (XIX ст.).
- могілкі яўрэйскія.
- царква Святога Юрыя (1901). [3]

**Паэты**

**Вінцук Адважны** (сапр. Германовіч Язэп Станіслававіч; 1890–1978) – беларускі пісьменнік, каталіцкі святар усходняга абраду, паэт, публіцыст. [3]

**Другі прыпынак в. Маркінята**

Адлегласць ад аг. Гальшаны – 8 км; час – 20 хвілін.

**Маркінята –** веска ў Ашмянскім раене Гродзенскай вобласці, Гальшанскага сельсавета. [3]

**Славутасці (турыстычныя аб’екты)**

На ўскраіне вескі, на левым беразе ракі Клява знаходзіцца курганны могільнік: 7 насыпаў вышынею 6–8 м (абследаваны ў 1974 г. А. Калечыц, раскапаны 4 курганы).

Знойдзены рэшткі пахаванняў, а таксама сякеры, ромбападобныя і ланцэтападобныя наканечнікі коп'яў, нажы, шпоры, спражкі, бронзавыя ўпрыгожанні і дэталі конскай збруі. Датуецца X–XI ст., адносіцца да культуры ўсходнелітоўскіх курганоў. [9]

**Паэты**

**Валянціна Ліштван** нарадзілася ў весцы Маркінята Ашмянскага раена. Вучылася ў Міхайлоўшчынскай базавай школе, затым у Гродзенскім вучылішчы мастацтваў на аддзяленні харавога дырыжыравання. Музычны слых і паэтычны дар атрымала ў спадчыну ад бацькі Вацлава Канстанцінавіча.

Вольны час прысвячае напісанню вершаў. Большасць з іх пра Радзіму, бацькоў, пра тыя месцы, дзе прайшло яе дзяцінства.

Дадзены праект будзе мець працяг: адкрыцце новых іменаў у сучаснай мясцовай літаратуры, стварэнне новых веламаршрутаў. Праект выкарыстоўваецца ў навучальных установах пры планаванні шостага школьнага дня, пры правядзенні экскурсій сумесна з законнымі прадстаўнікамі вучняў, пры арганізацыі экскурсій з турыстамі. Праект дае магчымасць сфарміраваць інтарэс людзей да чытання мастацкай літаратуры, прыцягнуць увагу сучаснага пакалення да здаровага ладу жыцця.

**Літаратура**


1. Антановіч, К. // У Барунах па каралеўскім прывілеі // «Культура» №18, 2010 г.
2. Беларуская Палічка: http:// www.knihi.com.
3. Вікіпедыя. https://be.wikipedia.org/wiki.
4. Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Дакурнішскі вучэбна-педагагічны комплекс яслі-сад-сярэдняя школа». https://upk-dokurnishki.schools.by.
5. Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Жупранскай сярэдняя школа імя Ф.К.Багушэвіча» А.Г. Жупраны .https://zhuprany.schools.by.
6. Кальчунскай сярэдняй школы. http://kolchuny.by/.
7. Конан, У. Андрэй Зязюля: хрысціянская філасофія і асветніцкая дзейнасць // Наша вера. – 2001. – № 4. – С. 18–23.
8. Лойка, А.А. Андрэй Зязюля // Гісторыя беларускай літаратуры. Дакастрычніцкі перыяд: у 2 ч. – Ч. 2: Падручнік для філал. фак. ВНУ. – Мінск, 1989. – С. 445–451.
9. Памяць: Гіст.-дакум. хронікаАшмянскага раена. – Мн. : БЕЛТА, 2003. – 688 с.: іл.
10. Цвірка, К. Тэлемак з-пад Ашмянаў. Жыцце і творчасць Антонія Эдварда Адынца // Роднае слова. – 1994. – № 3. – С. 7.


**GORGEOUS AND UNIQUE ASHMYANSHCHYNA: LITERARY-TOURIST BICYCLE PROGECT**

**M.I. Bogdanovich**

This article provides information about the structure of the literary and tourist bicycle project. This project is made with the purpose of preserving the literary heritage of a small country.

The aims of this project are improving the reader's interest and preserving health through bike tour of Oshmyany area.

Literary-tourism project is used in educational institutions in planning the sixth school day, during excursions, together with the legitimate representatives of students during the organization of excursions with tourists.

**Keywords:** literary and tourist bike tour, tourist objects, attractions, videos and photos of the villages, information about the life and work of local poets, development of cognitive interest of young people for studying the literature of local writers.